У слаўным, родным Магілёве
Жыві, працуй, вучысь, кахай!
Геройскі горад беларускі –
Славянскі, шчыры, мілы край!

Гэтымі радкамі верша Уладзіміра Кавалева, беларускага навукоўца, ураджэнца Магілеўскай вобласці, 10 лютага ў вучняў 3 "Б" класа распачалося завочнае падарожжа «Родны Магілеў».

«Сення я хачу правесці вас па зямлі, якая для мяне, і, безумоўна, не толькі для мяне – даражэйшая за ўсё на свеце. Гэта самы ўтульны і чароўны куточак – горад Магілеў, мая і ваша малая радзіма,» – з такімі словамі звярнулася да вучняў настаўніца.

У час вандроўкі вучні складвалі і тлумачылі прыказкі аб сваей Радзіме, чыталі вершы пра Магілеў.

Асабліва захапіла відэаэкскурсія, дзякуючы якой дзеці «прайшліся» па самых вядомых вуліцах нашага горада: Першамайскай і Ленінскай, «зазірнулі» у музей горада Магілева, які знаходзіцца ў ратушы, «наведалі» драматычны тэатр. А яшчэ «пабывалі» у месцы, значным не толькі для магіляўчан, але і для ўсіх жыхароў нашай роднай Беларусі – на Буйніцкім полі. Хвілінай маўчання навучэнцы ўшанавалі памяць загінуўшых абаронцаў Магілева.

Гэта мерапрыемства дапамагло фарміраваць у вучняў паважлівыя адносіны да сваёй Айчыны, садзейнічала выхаванню ў дзяцей пачуцця любові да зямлі бацькоў, да роднага краю, павагу да культуры свайго народа.

Кл. кіраўнік: Яфімчанка А. В.



